# * § 8–0. Еўрапейскае грамадства ў Раннім і Высокім сярэднявеччы

**1. Карпаратыўны прынцып арганізацыі эканамічнай дзейнасці ў гарадах.** Эканамічная дзейнасць гараджан, яе вытворчая (рамеснікі), гандлёвая (купцы) і абслуговая (лекары, шынкары і інш.) галіны былі арганізаваны паводле карпаратыўнага прынцыпу, г. зн. толькі член пэўнай карпарацыі мог займацца ў горадзе сваёй прафесійнай дзейнасцю.

*Карпарацыя* (ад лац. *corporatio* — аб'яднанне) у кантэксце заходнееўрапейскага Сярэднявечча азначае замкнута-манапольнае грамадства з фіксаванымі правамі і абавязкамі, структурай і ўнутранай іерархіяй, грамадскім статусам, зафіксаваным у законах або традыцыях.

Ва ўмовах панавання натуральнай гаспадаркі феадальная вотчына была эканамічна самадастатковая: усё неабходнае выраблялася ў гаспадарцы феадала. Асноўнымі спажыўцамі гарадскіх тавараў былі самі гараджане. Толькі нязначная частка прадукцыі ішла на экспарт. Ва ўмовах вузкага спажывецкага рынку карпаратыўны прынцып арганізацыі гарадской эканомікі быў своеасаблівым механізмам рэгулявання вытворчасці. Рамесныя цэхі сачылі за якасцю гатовай прадукцыі, рэгулявалі аб'ёмы вытворчасці і збыту, вызначалі мінімальна неабходны ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі.

1. Чаму ў аснову арганізацыі гарадской эканомікі быў пакладзены карпаратыўны прынцып?
2. Як вы лічыце, ці быў такі прынцып характэрны для арганізацыі эканомікі ў сельскай мясцовасці? Прывядзіце аргументы.